*Славяна Шамякіна*

# КАЗКІ ПРА АСІЛКАЎ

Казкі пра асілкаў – разнавіднасць чарадзейна-фантастычных казак. Яны вылучаюцца ў асобную групу на падставе асаблівасцей сюжэта і спецыфічнага тыпу галоўнага героя. У цэнтры сюжэта – персанажы, надзеленыя звышнатуральнай фізічнай сілай, вялікай мужнасцю, часта падкрэсліваюцца іх выдатны розум, магічныя здольнасці. У якасці супраціўнікаў-антаганістаў асілкаў звычайна выступаюць фантастычныя істоты. Найчасцей у беларускіх казках дзейнічаюць героі з такімі імёнамі: Івашка Мядзведжае вушка, Іван Кабылін (Сучкін) сын, Вячорка, Паўношнік і Заравы, Кацігарошка, Кірыла Кажамяка і інш. Сустракаюцца таксама героі, аднолькавыя з персанажамі былін (Ілля Мурамец).

Для казак пра асілкаў характэрны наступныя традыцыйныя матывы:

1) цудоўнае нараджэнне галоўнага героя (напрыклад, ад шлюбу жанчыны з мядзведзем; ад з’ядання будучымі маткамі асілкаў чароўнай рыбы, прычым самы моцны герой нараджаецца ад кабылы ці сабакі і да т.п.);
2) хуткае сталенне героя «не па днях, а па гадзінах»;
3) выпрабаванне героем сваёй моцы (напрыклад, шляхам падкідвання ўгару зброі – адначасова выпрабоўваецца і зброя);
4) здабыванне багатырскага каня і зброі (для гэтага герою прыходзіцца выконваць цяжкія заданні Бабы-Ягі, вучыцца ў чараўніка, лезці ў падземную турму і вызваляць адтуль магічнага каня і інш.);
5) двубой з ворагам (часцей за ўсё шматгаловым Змеям ці трыма Змеямі з усё большай колькасцю галоваў, жонкамі і маткай забітых Змеяў, Кашчэем Бессмяротным і г. д.);
6) вызваленне дзяўчыны (прыкладам, выкрадзенай Змеям ці Кашчэем) і шлюб з ёю;
7) абарона свайго статуса ад прэтэнзій ілжэгерояў.

Верагодна, казкі пра асілкаў паходзяць ад гераічных міфаў, для якіх таксама характэрны героі-волаты і многія ўказаныя матывы.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Кабашников, К. П.* Сказка богатырская / К. П. Кабашников // Восточнославянский фольклор : слов. науч. и нар. терминологии / редкол. : К. П. Кабашников (отв. ред.) и др. – Минск : Наука и техника, 1993. – С. 314.
2. *Новиков, Н. В.* Образы восточнославянской волшебной сказки / Н. В. Новиков ; отв. ред. В. Е. Гусев. – Л. : Наука, 1974. – 256 с.